# Рэгламент конкурсу
# Free Belarus Business Awards IV

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Конкурс "Free Belarus Business Awards" (далей — Конкурс) з'яўляецца адкрытай падзеяй (удзел могуць браць удзельнікі, якія адпавядаюць крытэрам п. 1.4. Рэгламента, без дадатковых абмежаванняў, СМІ могуць распавядаць пра Конкурс і прысутнічаць на урачыстай цырымоніі ўзнагарод).

1.2. Арганізатарам конкурсу з’яўляецца Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой (ABBA), якая можа фарміраваць арганізацыйны камітэт Конкурсу з супрацоўнікаў ABBA і знешніх спецыялістаў, якіх абірае ABBA (далей – Арганізатар). Арганізацыя і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Звязу (далей - Спонсар). Палажэнні Рэгламенту распрацаваныя з улікам палажэнняў партнёрскай дамовы ў межах праграмы падрымкі беларускага бізнесу за мяжой.

1.3. Мэта конкурсу — адзначэнне дасягненняў новага бізнесу вольнай Беларусі за мяжой, а таксама заахвочванне людзей, якія знаходзяць сілы і спосабы адаптавацца і весці свой бізнес па-за межамі краіны, ствараюць спрыяльныя ўмовы працы для сваіх супрацоўнікаў, дэманструюць устойлівасць і здольнасць развівацца ў няпростых умовах.

Арганізатар ладзіць конкурс, каб адзначыць бізнесы і праекты беларусаў, зарэгістраваныя за мяжой, якія ўмацоўваюць свае пазіцыі на замежным рынку і шукаюць уласныя магчымасці ў рынкавых нішах.

1.4. Удзел у Конкурсе адкрыты для прадпрымальнікаў і арганізацый (юрыдычныя асобы і ІП) з беларускімі караням (маюць не менш за 50% беларускага ўстаўнога капіталу або 50% долі беларускіх удзельнікаў), якія ажыццяўляюць камерцыйную і некамерцыйную дзейнасць і зарэгістраваныя ў Еўрапейскім Звязе, не раней за жнівень 2020 года.

1.5. Пераможцы конкурсу  Free Belarus Business Award II (лістапад 2023) не могуць удзельнічаць у Конкурсе, згодна з рэгламентам папярэдняга конкурсу.

1.6. Назвы фіналістаў і пераможцаў Конкурсу будуць публічна абвешчаныя на ўрачыстай цырымоніі ўручэння ўзнагародаў, апублікаваныя на сайце і ў сацыяльных сетках Конкурсу, могуць быць названы СМІ, будуць зазначаны ў справаздачах па выніках Конкурсу. Ананімны ўдзел у Конкурсе немагчымы.

## 2. Намінацыі Конкурсу

2.1. Намінацыі Конкурсу вызначаюцца Арганізатарам і фіксуюцца ў Рэгламенце. Кожны з удзельнікаў можа атрымаць узнагароду Конкурсу ў адной з намінацый.

### 2.1.1. Некамерцыйная арганізацыя года

Прысуджаецца за выдатныя дасягненні і ўнёсак некамерцыйных арганізацый у рэалізацыю сваёй місіі, стварэнне станоўчага ўплыву на грамадства і эфектыўнае кіраванне рэсурсамі. Арганизацыя дэманструе пры гэтым стабільнасць, падтрымлівае добрыя адносіны са сваімі чальцамі, персаналам і валанцёрамі, а таксама ўжывае найлепшыя метады арганізацыі дзейнасці.

Крытэры адзнакі:

- Місія і мэта.
- Уздзеянне на мэтавую аўдыторыю, грамадства або навакольнае асяроддзе, змены ў адпаведнай вобласці.
- Падыход да рашэння задач і дасягнення сваёй місіі (распрацоўванне новых метадалогій, развіццё партнёрскіх адносін або выкарыстанне тэхналогій і г.д.).
- Стандарты і прынцыпы дзейнасці (абыходжанне з супрацоўнікамі і валанцёрамі, працэс прыняцця рашэнняў і г.д.).
- Устойлівасць дзейнасці і імкненне да доўгатэрміновых вынікаў.
- Супраца і ўзаемадзеянне з арганізацыямі, уладамі, прыватнымі асобамі і супольнасцямі.
- Доказы дасягненняў (колькасныя паказнікі, канкрэтныя прыклады станоўчых зменаў, узнагароды, прызнанне ў грамадстве, станоўчыя водгукі ад партнёраў, донараў або ўдзельнікаў і да т.п., якія пацвярджаюць важную ролю дадзенай арганізацыі ў вырашэнні задач).
- Карпаратыўная культура і стандарты дзейнасці.

### 2.1.2. Сацыяльнае прадпрыемства года

Намінацыя закліканая адзначыць і заахвоціць арганізацыю, якая паспяхова спалучае сваю камерцыйную дзейнасць з вырашэннем сацыяльных праблем і прыносіць станоўчыя змены ў грамадстве, паляпшэнне жыцця людзей і навакольнага асяроддзя. Прысуджаецца кампаніі, якая прадэманстравала выключную прыхільнасць і поспех у інтэграцыі сацыяльных і экалагічных задач у сваю асноўную дзейнасць.

Крытэры адзнакі:

- Місія і мэты, арыентаваныя на вырашэнне канкрэтных сацыяльных або экалагічных праблем.

- Канкрэтныя доказы і вынікі ўздзеяння на грамадства і/або навакольнае асяроддзе і/або мясцовыя супольнасці.
- Устойлівасць дзейнасці і імкненне да доўгатэрміновых вынікаў.
- Падыходы, прадукты або паслугі, якія спрыяюць дасягненню сацыяльных і экалагічных мэтаў (бізнес-мадэлі, тэхналагічныя дасягненні, творчыя рашэнні, г.д.).
- Інтэграцыя сацыяльнай місіі ў асноўную камерцыйную дзейнасць.
- Адкрытасць у дачыненні да сацыяльнай дзейнасці (публічнасць інфармацыі аб дасягненнях, уплыве і намаганнях для рэалізацыі місіі).
- Патэнцыял кампаніі для далейшага развіцця.
- Узаемадзеянне з супольнасцю, развіццё партнёрскіх адносін з іншымі арганізацыямі і ўстановамі.
- Якасць і даступнасць інфармацыі аб ініцыятывах, прагрэсе і выніках, зносіны з зацікаўленымі бакамі, у тым ліку кліентамі, супрацоўнікамі, інвестарамі, шырокай грамадскасцю.
- Фінансавая жыццяздольнасць і аперацыйная стабільнасць.
- Супраца з няўрадавымі арганізацыямі, дзяржаўнымі ўстановамі, мясцовымі супольнасцямі і г.д..
- Карпаратыўная культура і стандарты дзейнасці.

### 2.1.3. Інавацыйны бізнес года

Намінацыя закліканая адзначыць і заахвоціць кампанію, якая праяўляе выключную крэатыўнасць, вынаходлівасць і дальнабачнасць у сваёй сферы дзейнасці, ажыццяўляючы распрацоўку і ўкараненне інавацыйных ідэй, прадуктаў, паслуг, працэсаў або стратэгій, якія аказалі значны станоўчы ўплыў на арганізацыю, галіну або грамадства ў цэлым.

Крытэры адзнакі:

- Ідэя, канцэпцыя, прадукт, паслуга, працэс або стратэгія ці іншыя аспекты бізнесу, у тым ліку, вытворчыя метады, маркетынгавыя падыходы і г.д., у якіх заключаецца інавацыя
- Вынік або дасягненні (напрыклад, павышэнне эфектыўнасці, якасць абслугоўвання кліентаў, павышэнне прадукцыйнасці або сацыяльнае ўздзеянне і г.д.)
- Дакументацыя і доказы распрацоўвання, укаранення і ўздзеяння інавацыі (планы праектаў, прататыпы, аналіз дадзеных, водгукі, параўнання да і пасля, а таксама адпаведнае асвятленне ў СМІ)
- Доказы паспяховай рэалізацыі інавацыі, у тым ліку колькасныя і якасныя паказнікі, вынікі даследаванняў і г.д.
- Канкурэнтная перавага на рынку, якую дае інавацыя

- Уплыў на арганізацыю, галіну або індустрыю (ацэнка колькасных паказнікаў, водгукі, тэматычныя даследаванні або іншыя адпаведныя доказы)
- Практыка ужывання і патэнцыял для інтэграцыі ў бізнес-працэсы кампаніі
- Падыход да вырашэння праблем і дасягнення мэтаў
- Ступень арыгінальнасці, крэатыўнасці і ўнікальнасці, адрозненне ад традыцыйных практык і нормаў
- Устойлівасць дзейнасці і доўгатэрміновасць вынікаў
- Этычныя і сацыяльныя фактары інавацыі
- Карпаратыўная культура і стандарты дзейнасці.

### 2.1.4. Брэнд года

Намінацыя вылучае і адзначае бізнес, які прадэманстраваў выдатныя дасягненні ў галіне стратэгіі брэндынгу, выключнае майстэрства і інавацыі ў кіраванні і развіцці брэнда, прыцягнення кліентаў і работнікаў. Гэтая намінацыя прызнае брэнд, які даказаў сваю ўнікальнасць, эфектыўна даносіць свае каштоўнасці, прынцыпы і прапановы, знаходзіць водгук, заслужыў давер і адданасць сваёй мэтавай аўдыторыі, захоўвае канкурэнтныя перавагі на рынку.

Крытэры адзнакі:

- Паслядоўнасць і цэласнасць візуальных элементаў (лагатып, колеры, дызайн і тп.).
- Адметныя рысы і ўнікальныя прапановы, якія дапамагаюць вылучыць яго сярод канкурэнтаў.
- Інавацыйныя і творчыя падыходы да прасоўвання, укаранёныя ідэі і канцэпцыі, якія адрозніваюць яго ад канкурэнтаў і прыцягваюць мэтавую аўдыторыю.
- Уздзеянне на адпаведны рынак або галіну і грамадства ў цэлым, пазнавальнасць, лаяльнасць кліентаў, дынаміка долі рынку.
- Эфектыўнасць узаемадзеяння з мэтавай аўдыторыяй.
- Планаванне і рэалізацыя стратэгіі развіцця брэнда на працягу апошняга года, здольнасць прыстасавання да зменлівых тэндэнцый рынку і спажывецкім перавагам.
- Дапаможныя матэрыялы, такія як: рэкламныя матэрыялы брэнда, маркетынгавыя кампаніі, водгукі кліентаў і адпаведныя звесткі, каб прадэманстраваць свае дасягненні, доказы свайго прызнання ў галіне (узнагароды, рэйтынгі або станоўчыя водгукі ад уплывовых экспертаў і аналітыкаў) і да т.п.
- Карпаратыўная культура, адпаведнасць галіновым стандартам, рэпутацыя і аўтарытэт на рынку.

#### 2.1.5. Найлепшы бізнес года

- Устойлівы фінансавы рост, павелічэнне выручкі, прыбытку і іншых ключавых паказнікаў за апошні каляндарны год.
- Інавацыйнасць падыходу ў дзейнасці, у тым ліку распрацоўванне новых прадуктаў або паслуг, ужыванне прасунутых тэхналогій, а таксама эфектыўнае выкарыстанне сучасных метадаў кіравання.
- Кадравая палітыка.
- Карпаратыўная і сацыяльная адказнасць.
- Эфектыўнасць метадаў лідарства і кіравання, іх уплыў на рост, стабільнасць і поспех кампаніі (гэта ўключае ў сябе прыняцце стратэгічных рашэнняў, развіццё супрацоўнікаў, фармаванне пазітыўнай арганізацыйнай культуры і г.д.).
- Уплыў на бізнес-супольнасць, уключаючы стварэнне працоўных месцаў, спрыянне развіццю мясцовай эканомікі і ўдзел у дабрачынных і грамадскіх ініцыятывах.
- Актыўны ўдзел і пазітыўны унёсак у жыццё мясцовай супольнасці/супольнасцяў.
- Прафесійнае развіццё і ўцягнутасць супрацоўнікаў.
- Рэпутацыя і прызнанне (узнагароды, водгукі кліентаў, удзел у важных галіновых падзеях і г.д.).
- Якасць прадуктаў і паслуг, іх адпаведнасць запатрабаванням кліентаў і індустрыяльным стандартам.
- Карпаратыўная культура.

**2.2.** У кожнай намінацыі журы ацэньвае удзельнікаў, па выніках фарміруецца спіс з 4 фіналістаў, калі іншае не вырашыць журы. З фіналістаў абіраецца 1 пераможца. Пераможцы Конкурсу атрымліваюць мэтавую фінансавую падтрымку, якую неабходна выкарысаць на развіццё бізнесу (праекту), у тым ліку, але не выключна, на ўвядзенне інавацый (закупка абсталявання, праграмнага забеспячэння, і т.д.) інфарматызацыю працэсаў, на пераход на больш экалагічныя рэсурсы і працэсы, на навучанне супрацоўнікаў.

## 3. Парадак правядзення Конкурсу

### 3.1. Рашэнне Арганізатара аб правядзенні Конкурсу і фармаванне журы

3.1.1. Арганізатар прымае рашэнне аб правядзенні Конкурсу. Арганізатар разам з Спонсарам вызначае назву Конкурсу, намінацыі Конкурсу, патрабаванні да ўдзельнікаў, асноўныя тэрміны (пачатак і канец прыняцця заявак удзельнікаў Конкурсу, тэрміны 1 і 2 этапаў разгляду заявак удзельнікаў, дата падвядзення вынікаў і ўзнагароды), асаблівыя правілы і патрабаванні Конкурсу.

3.1.2. Арганізатар зацвярджае Рэгламент. Рэгламент публічна размяшчаецца на афіцыйным сайце конкурсу (п. 5.1. Рэгламенту).

3.1.3. Конкурс складаецца з наступных этапаў:

- абвяшчэнне Конкурсу (п. 3.2. Рэгламенту);
- прыняцце і разгляд заявак для удзелу у Конкурсе (першы этап конкурсу) (п. 3.3. і 3.4. Рэгламенту);
- ацэнка удзельнікаў Конкурсу (другі этап конкурсу) (п. 3.5. Рэгламенту);
- падвядзенне вынікаў Конкурсу (п. 4 Рэгламенту)

Арганізатар зацвярджае форму заяўкі для ўдзельнікаў Конкурсу (далей — Форма), а таксама анкету для ўдзельнікаў другога этапу Конкурсу (далей — Анкету). Формы ствараюцца Арганізатарам з дапамогай функцыяналу сайту https://forms.monday.com, Анкета — з дапамогай функцыяналу сайту https://www.google.com/forms. Афіцыйная спасылка на Форму і Анкету публічна размяшчаюцца на афіцыйным сайце і ў сацыяльных сетках Конкурсу (п. 5.1. Рэгламенту). Форма і Анкета павінны быць запоўненыя на ангельскай мове упаўнаважаная асоба ўдзельніка.

3.1.4. Арганізатарам фарміруецца склад журы Конкурсу. Звесткі аб журы публічна размяшчаюцца на афіцыйным сайце конкурсу (п. 5.1. Рэгламенту). У склад журы не могуць быць уключаныя прадстаўнікі і супрацоўнікі Арганізатара, удзельнікаў Конкурсу. Журы складаецца з незалежных міжнародных бізнес-экспертаў, прадстаўнікоў розных кірункаў бізнес-дзейнасці. Склад журы — не болей за 7 асоб.

**3.2. Абвяшчэнне Конкурсу**

3.2.1. Прадстаўнікі Арганізатара публічна абвяшчаюць аб правядзенні Конкурсу ў глабальным сеціве Інтэрнэт праз афіцыйныя сацыяльныя сеткі (п. 5.1. Рэгламенту).

**3.3. Прыняцце заявак удзельнікаў Конкурсу**

3.3.1. У дзень, зазначаны ў рашэнні Арганізатара, адчыняецца Форма і пачынаецца прыём заявак на ўдзел у Конкурсе. Каб запэўніць бяспеку асабістых звестак, удзельнікі выкарыстоўваюць выключна спасылку на Форму з афіцыйнага сайту або сацыяльных сетках Конкурсу (п. 5.1. Рэгламенту).

3.3.2. Патрабаванні адносна запаўнення Формы зазначаныя ў яе прэамбуле, а таксама ў тэксце Формы. Арганізатар дасылае паведамленне аб прыняцці Формы не пазней 5 працоўных дзён з даты яе атрымання.

Для ўдзелу ў Конкурсе трэба даслаць Форму не пазней за дату заканчэння прыняцця заявак, зазначанай Арганізатарам. Пасля заканчэння тэрміну прыняцця заявак удзельнікаў Конкурсу Форма аўтаматычна становіцца недаступнай.

3.3.3. Дата пачатку прыняцця заявак ад удзельнікаў Конкурсу: 23 ліпеня 2024 года.

3.3.4. Дата заканчэння прыняцця заявак ад удзельнікаў Конкурсу: 18 жніўня 2024 года.

Тэрмін этапу прыняцця заявак можа быць падоўжаны рашэннем Арганізатара. Аб гэтым апошні публічна папярэджвае праз афіцыйныя сацыяльныя сеткі.

3.3.5. Удзельнік можа падаць толькі 1 (адну) заяўку і толькі шляхам запаўнення онлайн-формы. Пры запаўненні большай колькасці формаў, папярэдняя(ія) заяўкі анулююцца Арганізатарам.

3.3.6. Арганізатар не карэктуе і не дапаўняе адказы ўдзельніка, пазначаныя ў Форме, пасля яе атрымання.

3.3.7. Арганізатар не дасылае ўдзельніку копію запоўненай Формы. Арганізатар не дасылае Форму трэцім асобам, за выключэннем чальцоў журы.

3.3.8. Далейшая камунікацыя паміж удзельнікам (упаўнаважанай асобай) і Арганізатарам адбываецца праз электронную пошту (электронная скрыня Арганізатара згодна з п. 5.1. Рэгламенту, электронная скрыня ўдзельніка Конкурсу згодна з Формай). Пры адсутнасці адказу ўдзельніка Арганізатар дасылае паведамленне праз Teleram (Teleram Арганізатара згодна з п. 5.1. Рэгламенту, Teleram удзельніка Конкурсу згодна з Формай). Камунікацыя паміж удзельнікам і Арганізатарам праз іншыя сродкі камунікацыі не ажыццяўляецца. Камунікацыя ажыцяўляецца ў працоўныя дні з 10.00 да 18.00 па варшавскім часе.

3.3.9. Удзельнік мае магчымасць абраць адну або некалькі намінацый, у якіх ён жадае ўдзельнічаць.

**3.4. Першы этап Конкурсу**

3.4.1. Пасля атрымання Формы Арганізатар пакідае за сабой права патрабаваць ад удзельніка дадатковыя тлумачэнні і дакументы для пацверджання зазначанай у Форме інфармацыі пра ўдзельніка. Арганізатар у такім выпадку вызначае дадатковы тэрмін для атрымання адказу ўдзельніка і дакументаў.

3.4.2. Тэрмін правядзення першага этапу Конкурсу:

23.07.2024 года - 18.08.2024 года

3.4.3. На дадзеным этапе Арганізатар правярае заяўку ўдзельніка на адпаведнасць фармальным крытэрыям:

- магчымасць удзелу ў Конкурсе згодна з п. 1.4., 1.5. Рэгламенту,

- карэктнае запаўненне Формы,

- адсутнасць пытанняў, якія патрабуюць дакументальнае пацверджанне.

3.4.4. Па выніках першага этапу Арганізатар накіроўвае ўдзельніку праз электронную пошту рашэнне:

- аб магчымасці ўдзелу ў другім этапе Конкурсу,

- аб немагчымасці далейшага ўдзелу ў Конкурсе.

3.4.5. Рашэнне Арганізатара з'яўляецца канчатковым.

3.4.6. Калі ўдзельнік не рэагуе на паведамленне Арганізатара, не выконвае патрабаванняў Арганізатара ў зазначаны тэрмін, ён выключаецца з удзельнікаў Конкурсу, аб чым Арганізатар дасылае паведамленне.

**3.5. Другі этап Конкурсу**

3.5.1. Пасля пачатку другога этапу Конкурсу Арганізатар дасылае ўдзельнікам, якія атрымалі рашэнне аб магчымасці ўдзелу ў другім этапе Конкурсу, паведамленне і просьбу аб выкананні дадатковых дзеянняў (у тым ліку, але не выключна, запаўнення падрабязнай Анкеты). Арганізатар у такім выпадку вызначае дадатковы тэрмін для атрымання адказу ўдзельніка.

Удзельнік да падачы Анкеты можа прыняць аднабаковае рашэнне аб адмове ад далейшага ўдзелу ў Конкурсе. Для гэтага прадстаўнік удзельніка, упаўнаважаны да прадстаўніцтва ўдзельніка згодна з адпаведным да рэзідэнцыі ўдзельніка заканадаўствам, дасылае паведамленне на афіцыйную электронную пошту Арганізатара (п. 5.1 Рэгламенту).

3.5.2. На дадзеным этапе Арганізатар перадае журы інфармацыю пра кожнага ўдзельніка, змешчаную ўдзельнікам у Форме і Анкеце. Журы ацэньвае інфармацыю ад Арганізатара, а таксама звесткі, якія знаходзяцца ў адкрытым доступе.

Журы ацэньвае удзельнікаў і па выніках ацэнкі адзначае 4 фіналістаў у кожнай намінацыі, калі іншае не вызначана журы.

Сярод фіналістаў вылучаецца 1 пераможца на падставе комплекснага аналізу крытэрыяў (п. 2 Рэгламенту). Кожны чалец журы мае права ў кожнай намінацыі размеркаваць сярод фіналістаў 3, 2, 1 або 0 балаў, калі іншае не вызначана журы.

Пераможцам называецца фіналіст, які атрымаў найбольш балаў. Калі некалькі фіналістаў атрымалі аднольнавую колькасць балаў, ажыцяўляецца другі этап галасавання толькі па фіналістам, якія абралі аднолькавыя балы для вылучэння 1 пераможцы.

Журы перадае сваё рашэнне Арганізатару.

3.5.3. Па выніках другога этапу Арганізатар паведамляе ўдзельнікам праз электронную пошту:

- пра абранне ўдзельніка фіналістам Конкурсу і магчымасць прысутнічаць на цырымоніі ўзнагароджання,
- пра магчымасць прысутнічаць на цырымоніі ўзнагароджання.

3.5.4. Рашэнне журы, вынесеннае згодна з п. 3.5.3 Рэгламенту, з'яўляецца канчатковым, не падлягае абскарджанню. Рашэнне можа быць зменено пры выбыцці ўдзельніка (ліквідацыі юрыдычнай асобы або ІП, смерці ІП), у такім выпадку пераможцам абвяшчаецца фіналіст, якія па вынікам адзнак заняў другое месца у намінацыі.

3.5.5. Інфармацыя аб пераможцах Конкурсу з'яўляецца таямніцай (у тым ліку для Пераможцы Конкурсу) да моманту ўрачыстага абвяшчэння падчас цырымоніі ўзнагароджання.

**3.6. Дадатковыя падзеі ў межах Конкурсу**

У межах Конкурсу Арганізатар можа прапанаваць удзельнікам Конкурсу ўдзел у дадатковых адукацыйных падзеях, накіраваных на развіццё бізнес-навыкаў. Арганізатар публічна абвяшчае тэму, тэрмін і ўмовы для ўдзелу ў такой падзеі.

**4. Парадак падвядзення вынікаў**

4.1. Арганізатар запрашае праз электронную пошту Фіналістаў у кожнай намінацыі на фінальную ўрачыстую цырымонію ўзнагароджання. На цырымоніі пажадана прысутнічаць прынамсі аднаму прадстаўніку фіналіста, якому, у выпадку перамогі, будзе ўручаная ўзнагарода.

4.2. Цырымонія ўзнагароджання фіналістаў і пераможцаў Конкурсу адбудзецца публічна з удзелам прадстаўнікоў Арганізатара, журы, удзельнікаў, партнёраў, СМІ, у межах Беларускага бізнес-форуму ў Варшаве ў канцы верасня 2024 года. У цырымоніі могуць удзельнічаць прадстаўнікі ўдзельнікаў Конкурсу, старэйшыя за 18 гадоў. На цырымоніі будзе адбывацца фота і відэа с'емка.

4.3. На цырымоніі публічна будуць названыя фіналісты, а таксама пераможца ў кожнай намінацыі.

4.4. Пасля цырымоніі Арганізатар дасылае праз электронную пошту Дамову аб мэтавай фінансавай падтрымцы для развіцця бізнесу. Далейшая камунікацыя паміж Пераможцам і Арганізатарам ажыццяўляецца на падставе Дамовы.

4.5. На цырымоніі ўзнагароджання дзейнічае абавязковы дрэс-код, пра які Арганізатар паведамляе ў запрашэнні, калі іншае не вызначана Арганізатарам.

**5. Заключныя палажэнні**

**5.1. Афіцыйныя старонкі і кантакты Арганізатара**

Афіцыйны сайт Конкурсу https://freebelarusbusinessawards.org

Сацыяльныя сеткі Конкурсу:

Telegram https://t.me/freebelarusbusinessaward

Facebook https://www.facebook.com/freebelarusbusinessaward/

Instagram https://www.instagram.com/freebelarusbusinessaward/

E-mail Конкурсу freebelaward@abbabusiness.org

5.2. Змены ў Рэгламент могуць быць унесеныя рашэннем Арганізатара.